Хочу поблагодарить всех участников первого в мире референдума в мою поддержку с выбрасыванием разного рода предметов из окон и подвести некоторые его итоги. Считаю, что, несмотря на плохую организацию, он удался. Лично в меня, прогуливающегося под окнами домов во время референдума, попало 3 предмета. Как то: яйцо всмятку и несвежий носок. На мой взгляд, это красноречиво говорит о том, что люди готовы отдать за меня все самое дорогое, что у них есть. Третьим предметом была железобетонная балка, свалившаяся мне прямо на голову. Я расцениваю это как акт коллективной поддержки. Утверждения же моих оппонентов, будто бы это была случайно упавшая опора линии электропередач, считаю наглой инсинуацией.

После проведения референдума кое-где на улицах можно было наблюдать завалы. Все те же злопыхатели объясняют это неритмичной работой коммунальных служб и тем, что на улицах не убирали со времен последних выборов в Верховный Совет. По моему же глубокому убеждению, это лишний раз доказывает, что меня поддерживает по меньшей мере 99,9% избирателей.

Уже сегодня ко мне приходят телеграммы от партий и общественных объединений со словами поддержки.

Так, например, я получил очень теплое послание от "Черной сотни" и "Чертовой дюжины", от террористической организации мастурбаторов-одиночек и жертв научных опытов по методу Маркса.

Я не ограничиваюсь обещаниями дать хлеба и зрелищ. В случае моего избрания президентом я дам всем очень много хлеба и очень много зрелищ. Для этого всем новым министрам и новым председателям территориальных Советов я ставлю задачу в течение двух дней разработать рецептуру 50 новых сортов хлеба с добавлением философского камня, манны небесной и боба с горохом.

Лично мною заключен контракт с мексиканскими кинофирмами на производство еще трех тысяч серий фильма "Богатые тоже плачут" и сериала "Моя 33-я жена, или 33 несчастья".

Думаю, колеблющихся больше не осталось, и самое время рассказать подробнее о вашем новом президенте.

Так вот, у меня один диплом о высшем образовании и четыре волчьих билета. Объездил 5 материков, 6 государств, 3 города и 2 деревни. Знаю 12 языков, 11 из которых, кроме меня, не знает никто. Уверен, что буду очень хорошим президентом. Голосуйте за меня!

Все вышепрочитанное вами написано мною в полном здравии, при ясном рассудке и твердой памяти.

Михаил БРЯНСКИЙ.

ЗАМЕЖЖА

ІТАР-ТАСС * ІНТЭРФАКС * НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Пульс дня

Дакумент "...у імя міру"

Кіраўнікі краін НАТО на цырымоніі, якая адбылася ў Бруселі, падпісалі дакумент "Партнёрства ў імя міру". Як заявіў генеральны сакратар НАТО Манфрэд Вернер, прадугледжанае гэтым дакументам развіццё супрацоўніцтва арганізацыі з іншымі еўрапейскімі дзяржавамі заклікана ўмацаваць бяспеку і стабільнасць на ўсім кантыненце.

Былая Югаславія — агульны боль

Удзельнікі сесіі Савета НАТО на вышэйшым узроўні, якая адкрылася ў Бруселі, павінны аказаць максімальны націск на канфліктуючыя бакі ў Босніі і Герцагавіне, каб паскорыць заключэнне выніковага пагаднення аб мірным урэгуляванні ў былой Югаславіі. Аб гэтым заявіў міністр-дэлегат па еўрапейскіх справах Францыі Ален Ламасур, выступаючы ў праграме радыёстанцыі "Франс-энтэр".

Без Расіі няма Еўропы...

Трэба пазбягаць стварэння ў Еўропе сістэмы бяспекі, з якой была б выключана Расія. Такую думку выказвае Генеральны сакратар Савета Еўропы Катрын Лалюм'ер у артыкуле, апублікаваным у страсбургскай газеце "Дэрньер нувель д'альзас".

Паездка ў Маскву вельмі патрэбна Б.Клінтану

Як самую важную з усіх замежных паездак Біла Клінтана за час яго знаходжання на пасту прэзідэнта ЗША ахарактарызаваў маючы адбыцца візіт главы амерыканскай адміністрацыі ў Маскву Малколм Тун, які ў перыяд з 1976 па 1979 год быў паслом ЗША ў Савецкім Саюзе. "Для Клінтана надзвычай важна сустрэцца цяпер з прэзідэнтам Расіі Барысам Ельцыным, каб яны маглі даць сумесную ацэнку вынікам парламенцкіх выбараў і рэферэндуму па Канстытуцыі, якія адбыліся ў снежні, — сказаў М.Тун у інтэрв'ю карэспандэнту ІТАР—ТАСС. — Усе мы усведамляем, што цяпер вы сутыкаецеся з сур'ёзнымі ўнутранымі праблемамі, і нам неабходна весці перагаворы аб тым, як найлепшым чынам вам дапамагчы".

Перагаворы працягваюцца

Палесціна-ізраільскія перагаворы па пытанню аб практычнай рэалізацыі пагаднення аб увядзенні палесцінскага самакіравання на частцы акупіраваных арабскіх тэрыторый аднавіліся ў егіпецкім горадзе Таба. Як паведаміла інфармацыйнае агенцтва МЕНА, палесцінскую дэлегацыю ўзначаліў саветнік старшыні выканкама арганізацыі вызвалення Палесціны па палітычных пытаннях Набіль Шаат, ізраільскую — намеснік начальніка генштаба ўзброеных сіл Амнон Шахак.

Будуць ездзіць рускія і японцы без візы...

Імкнуцца пашыраць колькасць удзельнікаў праграмы па бязвізаваму абмену паміж жыхарамі Японіі і Паўднёвых Курылаў вырашана на расійска-японскіх кансультацыях, якія адбыліся ў Сапара, прысвечаных абмеркаванню перспектыў бязвізавага абмену ў 1994 годзе. У сустрэчы адміністрацыйных цэнтраў прэфектуры Хакайда прымалі ўдзел прадстаўнікі адміністрацыі Сахаліна, Паўднёва-Курыльскага раёна і мясцовых органаў улады прэфектуры Хакайда.

Міністр юстыцыі — двойчы міністр...

Міністр юстыцыі Нідэрландаў Эрнст Хірс Балін часова будзе выконваць абавязкі міністра ўнутраных спраў. Аб гэтым паведаміў намеснік прэм'ер-міністра, міністр фінансаў Вім Кок дэпутатам другой палаты генеральных штатаў (парламента). Падобнае рашэнне звязана з раптоўнай смерцю міністра ўнутраных спраў Нідэрландаў Іен Далес. Яна памерла ў ноч з нядзелі на панядзелак у сваім доме ў Утрэхце на 63-м годзе жыцця.

Польские новости

Виктор ШУТКЕВИЧ

1995 год будет отмечаться в Польше как год памяти жертв Катыньского расстрела.

На днях в Варшаве объявлено о создании почетного общественного комитета по подготовке мероприятий, посвященных 55-й годовщине этой трагедии. Возглавил комитет президент страны Лех Валенса.

Как считают в польском МВД, число убийств, совершенных в стране в течение этого года, перевалит к концу декабря за тысячу, но лишь одному убийце из десяти удается замести следы и уйти от ответа.

Сегодня в стране раскрывается также 80 процентов изнасилований. Хуже всего обстоит дело с ворованными машинами: лишь меньше половины их возвращают прежним владельцам. Так что берегитесь, белорусские автотуристы!

Нас чакае перамога тэтчэрызму!

Поспех кнігі Маргарэт Тэтчэр "Гады на Даўнінг-стрыт" прымусіў былую "жалезную ледзі" зноў узяцца за пяро.

Цяпер яна працуе над новым фаліянтам — "Біблій" філасофіі тэтчэрызму. Новая кніга будзе ахопліваць перыяд знаходжання кансерватараў у апазіцыі з 1974 па 1979 год, і ў ёй Маргарэт Тэтчэр, якую цяпер велічаюць баранесай і якая засядае ў палаце лордаў, дасць гранічна шчырыя характарыстыкі цяперашняму прэм'еру Джону Мэйджару і яго міністрам.

Праўда, работа над новай кнігай рухаецца не так хутка, як хацелася б, паколькі ў баранесы ўсё яшчэ баліць напрацаваная рука, пасля таго як яна паставіла свой аўтограф прыкладна на 50 тысячах экземпляраў сваёй першай кнігі. Толькі за першыя тры месяцы пасля выхаду ў свет было раскуплена 300 тысяч экземпляраў кнігі мемуараў Тэтчэр.

Краіны СНД сур'ёзна ўплываюць на дэмаграфічную сітуацыю ў Ізраілі

Паводле апошніх статыстычных даных, з 1989 года з СССР, а ў далейшым з краін СНД у Ізраіль прыбылі 475 тысяч чалавек.

Толькі ў мінулым годзе ў Ізраіль прыехалі 77 тысяч імігрантаў, з іх 65 тысяч з рэспублік былога СССР. Цяпер насельніцтва Ізраіля складае 5,3 мільёна чалавек.

Таксама паведамляецца, што каля 20 тысяч ізраільцян загінулі ў аўтакатастрофах на дарогах краіны с 1948 года, калі была створана яўрэйская дзяржава. За гэты ж перыяд ва ўсіх войнах, у якіх за апошнія 45 гадоў удзельнічала ізраільская дзяржава, страты арміі склалі 17 700 чалавек.

Дзівакі ўпрыгожваюць свет



Самы маленькі аўтамабіль

Самы маленькі аўтамабіль у свеце быў паказаны на аўтамабільнай выстаўцы ў горадзе Эсэне. Яго даўжыня — 1,98 метра, вага — 515 кг, а максімальная хуткасць — 140 км у гадзіну. Аўтар мадэлі — Ола Халейн са Швецыі.

Лячылі поліяміэліт і атрымалі... СНІД?

Сенсацыйную версію паходжання СНІДу прапанавалі медыкі ПАР.

Штуршком для паяўлення раней невядомага чалавецтву захворвання маглі стаць масавыя прышчэпкі ад поліяміэліту, якія праводзіліся ў 50-х гадах, мяркуе кіраўнік аддзела вірусалогіі медыцынскага універсітэта поўдня Афрыкі Майк Лекатсас.

Вынікі сваіх назіранняў ён апублікаваў у апошнім выпуску універсітэцкага бюлетэня. Зараз вакцыны поліяміэліту цалкам бяспечныя, аднак напачатку іх прымянення, калі небяспечны вірус яшчэ не быў выяўлены, мільёны доз прафілактычных сродкаў культываваліся на нырках малпаў, якія нярэдка з'яўляліся носьбітам малпінага вірусу імунадэфіцыту. Апошні на 80—90 працэнтаў падобны да ВІЧ, які выклікае СНІД у людзей. Так, узбуджальнік хваробы ад малпаў трапляў у чалавечы арганізм, дзе пры пэўных умовах ён мог перарадзіцца ў ВІЧ, які выклікае СНІД.

У сувязі з гэтым прафесар М.Лекатсас перасцерагае ад рызыкі, якой падвяргае сябе чалавецтва, пачаўшы трансплантацыю людзям органаў жывёлін, у прыватнасці, печані бабуінаў. Мы ж яшчэ поўнасцю не ведаем, якія вірусы носіць бабуін, і як яны сябе будуць паводзіць, калі іх прышчапіць людзям, піша вучоны.

Профессор и секретарша общались на уровне щипков и недвусмысленных предложений

Один из ведущих профессоров государственного университета в древней японской столице Киото в самом прямом смысле ушел в монастырь, столкнувшись с обвинениями в "сэкухара".

Этим малопонятным для несведущих термином, который представляет собой искаженную на японский манер аббревиатуру от двух английских слов, обозначают здесь сексуально окрашенные домогательства представителей одного пола к другому.

Уйти в отставку по "личным соображениям" и податься в близлежащий монастырь буддистской секты дзэн, где, как говорят, он исповедует аскетический образ жизни, 57-летнего Тору Яно вынудили появившиеся в университетском городке листовки. Маститый ученый, который в числе прочего является членом шведской королевской академии наук, обвинялся в них в сексуальных поползновениях в отношении своих секретарш. И хотя неизвестно доподлинно, чего, собственно, добивался и преуспел ли в этом Яно, одна из бывших секретарш уверяет, что в отношениях с ней профессор пытался уповать на мужскую силу, и рассчитывает на поддержку со стороны комитета прав человека киотосской ассоциации адвокатов. Переквалифицировавшийся в монахи ученый возглавлял в университете центр исследований проблем Юго-Восточной Азии, издав книгу "Холодная война" и юва". Полагают, однако, что с пути истинного его могло сбить именно близкое ознакомление со странами этого региона, куда, как ни клеймят позором подобное явление в Японии, весьма уважаемые подчас представители мужской части японского общества большими группами отправляются в секс-туры по дешевым тамошним борделям.

Термин "сэкухара" лишь совсем недавно обогатил японские словари иностранных слов, поскольку сексуальные приставания на уровне щипков или недвусмысленных предложений мужчин-начальников женщинам-подчиненным воспринимались чуть ли не как норма жизни в Японии, где статус женщины, по образному выражению одного западного журналиста, напоминал нечто среднее между положением птицы и мужчины. Однако история с Яно свидетельствует: времена меняются, в чем отдельные представители сильного пола, столкнувшиеся с весьма серьезными обвинениями в "сэкухара", усматривают "тлетворное влияние" феминистского движения на Западе.

Политика в лицах

Элла Памфилова:

"Только сильная экономика способна решить все житейские проблемы"

Имя этой невысокого роста светловолосой женщины стало широко известно в годы горбачевской перестройки, когда она, депутат Верховного Совета СССР, раскрыла тайны льгот и привилегий высшего чиновничества.

Ее смелостью восхищались. Подкупали совестливость, честный открытый взгляд. А потом был мужественный поступок: на заседании Верховного Совета Элла Памфилова на всю страну заявила о выходе из КПСС как организации, развращенной ложью, коварством, двуличием.

В 38 лет — два года назад — она, инженер электронной промышленности, стала российским министром социальной защиты населения.

12 декабря Элла Памфилова баллотировалась кандидатом в депутаты Государственной Думы от блока "Выбор России" в Калуге. Из 18 претендентов калужане предпочли ее. И еще одна деталь: она опередила ближайшего соперника на 57 тысяч голосов. На нынешних выборах в России это исключительная редкость. Э.А.Памфилова отвечает на вопросы корреспондента "Народной газеты" Леонида Фадеева..

— Элла Александровна, поздравляю вас с избранием в Государственную Думу. Депутатские обязанности вам хорошо знакомы, а как живется российскому министру? Не пришлось ли вам пересматривать свое отношение к привилегиям должностных лиц?

— У государственного работника должна быть только одна привилегия — честно служить людям... А в бытность депутатской комиссии война с чиновниками была горячей. И хотя о тех привилегиях, которые имели номенклатурные чины в свое время, сегодня не может быть и речи, однако эта когорта довольно изобретательна...

Меня тревожит более серьезная "болезнь". Некоторые начальники ловко прибирают к рукам куски государственной собственности, пользуясь несовершенством нашего законодательства. Моя "война" в некотором роде продолжается: министерство наше предъявило судебный иск к Министерству обороны Российской Федерации. Мы намерены возвратить народу дачи, захапанные у государства за бесценок военными чиновниками.

— А о вас не говорят, что, мол, пришла к власти — тоже нахапала?

— Нет, обо мне так не говорят. Живу с дочерью в обычной двухкомнатной квартире. Дачи нет и не строю... Служебный транспорт — обыкновенная "Волга", только оборудована радиотелефоном.

— А какая зарплата у российского министра?

— В декабре прошлого года Президиумом Верховного Совета министру установлен оклад в сумме 46 тысяч рублей. В течение года, вы знаете, инфляция не дремала. Произведена индексация два раза, как у всех госслужащих. Теперь оклад министра — 157 тысяч рублей. И никаких надбавок и пайков...

— Я знаю, Элла Александровна, что до министерского кресла вы были председателем небольшого профкома. Трудно быть высоким начальником? Довольны вы собой как министром?

— Крайне недовольна. Даже пыталась несколько раз подать в отставку... Но это вовсе не значит, что я опустила руки. Пусть у меня не все получается... Однако все, что я могла, что могу, я пытаюсь делать.

Несмотря на обвал текущих дел, когда бесконечно просят о помощи, а давать почти нечего, пытаюсь создать целостную систему социальной защиты россиян.

— Есть где-нибудь подобный опыт?

— Практически нет. За исключением нескольких стран. Хочется верить, что и в России скоро появится такая система социальной защиты, без которой очень трудно работать. Не успеваешь угнаться за изменчивым характером проблем. Казалось бы, что еще вчера, когда в стране был острейший дефицит продуктов питания, мы решали единственную задачу — не дать человеку умереть с голода, обеспечить детей, стариков куском хлеба, пакетом молока. А теперь вот новая проблема — дикая инфляция. Пришлось срочно решать задачу выживания по-иному: путем увеличения пенсий, пособий. Расходы нарастают, как снежный ком. Два месяца назад изыскали средства, чтобы выдавать пенсионерам ежемесячное пособие в сумме 11 тысяч рублей. С января эта надбавка увеличится до 19 тысяч.

— Качество социальных проблем меняется на глазах?

— Да. Если начнется процесс переструктуризации производства, Россия столкнется с острейшей проблемой безработицы. А это значит, что надо немедленно разрабатывать государственную программу создания дополнительных рабочих мест, в том числе и для пенсионеров, инвалидов. Ведь многие из них еще могут трудиться. Необходима система самообеспечения, самоподдержки.

Буквально недавно приняла самое активное участие в подготовке целого пакета важных документов, принятие которых откладывать невозможно даже на неделю. Многие беды нашей огромной армии пенсионеров, инвалидов, малообеспеченных детей — от несовершенства пенсионного законодательства. В нем — засилие чиновничьего крючкотворства, многие положения непонятны простому человеку, для "толкования" требуются такие многословные инструкции, которые займут целые тома. Как говорят, достойный подарок народу от "народных избранников". Да что уж тут говорить — за два года закон о защите инвалидов прошел только первое чтение...

— Элла Александровна, все республики бывшего Союза переживают сегодня большие трудности. Есть много проблем и в нашей республике. Видите ли вы общие пути выхода из затянувшегося экономического и социального бедствия?

— Сегодня всем очень трудно: и Республике Беларусь, и Украине, и нам. Преодолеть за короткое время проблемы, накопленные за долгие годы бездумного хозяйствования партноменклатуры, немыслимо. Наверное, мы не сразу поняли, что в одиночку очень трудно делать первые шаги к реформам. И получилось: кто во что горазд. А потому и результат разный. Знаю, что Беларусь запаздывает с реформами, это создает ей дополнительные трудности переходного периода. Но ведь иного пути нет. И россияне уже убедились, что необходимо энергичнее давать простор рыночным отношениям во всех сферах. Они в большинстве своем поддерживают реформаторский курс президентской команды, направленный на создание сильной экономики. Только сильная экономика способна решить все острые житейские проблемы. Обещать людям какие-то блага иным путем — это чистая демагогия в духе господина Жириновского.

— А в чем вы видите свою роль в блоке "Выбор России"?

— По стратегическим, по макроэкономическим параметрам я согласна с программой блока. Но это не значит, что я одобряю все ее положения. Я пришла в блок помочь нашим теоретикам возвратиться на грешную землю, чтобы правительство начало тесно увязывать реформу с интересами каждого человека, чтобы никогда наше общество не делилось больше на врагов.

— Вас выбрали в Госдуму. Не думаете ли оставить пост министра?

— Нет, конечно. Для меня и для всего блока очень важно доверие людей. И если мне его оказали больше, чем кому-то, то теперь самое время его оправдать конкретной работой.

— Элла Александровна, вы в последнее время много бывали в разъездах, встречались с избирателями. Какие вопросы задают люди министру, трудно на них отвечать?

— Какими бы трудными ни были вопросы и ответы, от них я не ухожу. Чаще всего речь идет о пенсионном законодательстве, которое несовершенно. У людей чувствуется постоянная тревога о завтрашнем дне. Или вот поступила такая записка: "Где вы были как член правительства, когда в Москве расстреливали людей?" И я честно отвечаю, что мы в правительстве виноваты в той ситуации, которая привела к гибели людей, что россияне подняли оружие друг на друга. Считаю, что трагедия произошла из-за неудачного исполнения силовыми ведомствами своей задачи. Они почти ничего не сделали, чтобы предотвратить кровопролитие.

— Остается ли время на личную жизнь?

— Свободного времени мало. Еле успеваю просмотреть некоторые газеты. Иногда прочитать одну-две странички любимой книги...

— А семья как относится к рабочим перегрузкам?

— У меня дочь Таня, ей семнадцать лет. Воспитываю одна... Бывает, что поругиваю ее, не без этого. Но в основном с ней взаимопонимание и взаимное доверие.

— Вы счастливы в жизни?

— Мне уже сорок... В личном плане есть все — и удачи, и разочарования. О моей жизни можно сказать, что она непростая, но полная. Чаще мне везет на хороших людей, с которыми общаюсь. А в общем, я благодарю судьбу за то, что она у меня такая вот — трудная и приносит мне радость в заботе о других, нуждающихся в помощи и поддержке.


НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Шахматы

Из творчества читателей

Сегодня мы знакомим любителей шахмат с двумя задачами, составленными начинающими проблемистами из Брестской области.

В.Тельпук (Лунинецкий р-н)



Белые: Kpd6, Ce6, Kb7, Kc5, пп. a3, d3 (6).
Черные: Kpb6, пп. a4, a5, a7 (4).
Мат в 3 хода.

В.Богай, В.Жук (г.Каменец)

Белые: Kpb8, Фe7, Лg3, Ce6, п. d5 (5).
Черные: Kpe5(1).
Мат в 2 хода.

Свои решения присылайте по адресу: **220013, Минск, ул. Б.Хмельницкого, 10а, редакция "Народной газеты", "Шахматы".**

Проверьте решения

Миниатюра В.Катышка (опубликована 23.09): 1. Ke6!

Задача В.Пилипенко ("Народная газета" за 1.10): 1. Kpg6! 1...Kph3 2. Cb8!, 1...Kpg3, 2. Cb8+, 1...h3 2. Kp:h5.

Трехходовка А.Корнеева (опубликована 22.10): 1.Kf4! 1...Kpc4 2. Фd3+, 1... c6 2. Фd2, и мат следующим ходом.

Задача С.Толстого (опубликована 27.10): 1.Фh1! Свои решения прислали тт. Рудков (Быховский р-н), Ананченко (Витебск), Орищук (Каменецкий р-н), Селицкий (Жлобин), Тихонов (Пуховичский р-н), Орлов (Гомель), Мирочицкий (Гродно), Ахрем, Смоленский, Чайковский (Минск), Шилов (Бобруйск), Василюк (Кобрин), Похилько (Дубровенский р-н).

Победа А.Карпова

В голландском городе Тилбурге проходил традиционный международный шахматный турнир, в котором приняли участие ведущие гроссмейстеры мира. Соревнование проходило по олимпийской системе с выбыванием проигравших. В финале встретились чемпион мира ФИДЕ москвич Анатолий Карпов с гроссмейстером из Львова Василием Иванчуком. Две основные партии их матча не принесли перевеса ни одному из соперников. Однако в дополнительных встречах, проводившихся с укороченным контролем времени, перевес был на стороне чемпиона мира, который и завоевал главный приз турнира. В турнире выступили белорусские гроссмейстеры Борис Гельфанд, Виктор Купрейчик (Минск) и Андрей Ковалев (Витебск), но все они выбыли из борьбы, проиграв на первых этапах розыгрыша.

Шашки

Из шашечной классики

Р.Серапионов



Белые: пп. a1, b2, b4, c5, d4, e5, f6 (7).
Черные: Д. e1, пп. a5, c3, e7 (4).

Запереть простую.

В этом, казалось бы, совершенно безнадежном положении, белые находят красивый путь к победе, при этом запирая черную шашку на двух разных полях. Причем в одном финале черная шашка повисает на поле c3 на четырех белых шашках. Найдите путь к решению задачи. Свои ответы присылайте по адресу: **220013, Минск, ул. Б.Хмельницкого, 10а, редакция "Народной газеты", "Шашки".**

Проверьте решение

"Найдите комбинацию" (опубликована 2.09): 1. cb6! c:a5 2. bc5! d:d2 3. ab4 a:c3 4. ed4 c:e5 5. f:f8 h:f4 6. cg5 h:f4 7. f:e3x.

"Как бы вы сыграли" ("Народная газета" за 15.09): I. В партии Е.Тюнев — В.Герцензон, 1948 г. последовало 1. bc3! d:b2 (1...d:h4 2. cd4) 2. ed4 ce3 3. ef2 a:c5 4. f:a1x. В позиции N 2 к цели ведет 1. cb6! a:e3 (1...gc5 2. h:b8) 2. cd4 ec5 3. cg5 ab4 4. f:h8x.

Задача Н.Пичугина (опубликована 8.10): 1. gf8 gh2 2. fd6 hg3 3. cb2 gf2 4. ge3 hg1 5. ef2 gh2 6. ce1 a:a1 7. ef4 h:e3 8. ef2 g:e3 9. hg3 10. a:g1 a:a1 11. gf2 2. ge3 hg3 a:a1 12. a:h1 cb2 13. ef4 9.

Концовка Ю.Шмидта (опубликована 27.10): 1. cb4 e:a5 2. gf4! gh6 3. ab4 a:c3 4. fe5 f:d4 5. fe5 ... 4.

Свои решения прислали тт. Степанчук (Кобрин), Ковалевская (Слонимский р-н), Казлаевский (Осиповичи), Рудков (Быховский р-н), Пинчук (г.п.Шумилино), Саленжинский (Рогачев), Волков (г.п. Сураж), Соколов (Витебск), Ахрем, Ковалев (Минск).

Беларусы і свет

І фіны святкуюць Купалле

Валерый ДРАНЧУК

Жывучы ў сталіцах, можна заставацца поўным правінцыялам і, наадварот — жывучы ў правінцыі, можна не толькі пакарыць сталіцу роднай Айчыны, але і з годнасцю прадстаўляць свой народ, сваю культуру, сваю мову, сваю Бацькаўшчыну далёка за яе межамі.

Якуб Лапатка жыве ў Наваполацку. Цяжка вызначыць адназначна і паўна, хто ён больш: настаўнік, літаратар ці дыпламат. Паспяхова спраўджае сябе ва ўсім. Калі браць па службе — выкладчык іспанскай мовы ў школе, выхоўвае нацыянальна свядомую змену. Як літаратар — пераклаў плойму беларускіх твораў на іспанскую, англійскую, фінскую мовы і разам з тым пашырыў нашай айчыннай літаратурныя гарызонты: іншамоўныя творы "загаварылі" па-беларуску. Як дыпламат — вёў перамовы ў Фінляндыі ад імя Беларуска-фінскага таварыства, запачаткаваў сувязі па лініі народнай адукацыі, экалогіі, інфармацыі. Для яго аднолькава важна — і грунтоўна, як след, падрыхтаваць да краязнаўчай летняй вандроўкі з дзецьмі ў блізкі родны свет і не ўпусціць шанц як мага лепш паслужыць маці Беларусі падчас чарговай паездкі да фінскіх сяброў, пацвердзіць тым самым (як бы між іншым, бо гэта будні) свой педагагічны і дэпутацкі рэйтынг (ён старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі і захаванню гістарычнай спадчыны гарсавета), а таксама званне сталага стыпендыята фінскага Інстытута па культурных сувязях з краінамі свету. Тым часам адзін з вучняў Якуба Лапаткі, нядаўні выпускнік Мінскага інстытута замежных моў, дзякуючы намаганням свайго школьнага настаўніка стаў першым ад Беларусі слухачом курсаў фінскай мовы, літаратуры і культуры ў Фінляндыі. Стараннямі настаўніка і вучня рыхтуецца беларуска-фінскі слоўнік.



Менталітэт фінаў, лічыць наваполацкі настаўнік і літаратар, шмат чым павучальны для нас. Зрэшты, ці толькі для нас — гэта цудоўны ўзор шматвяковага стаўлення да сваёй культуры і літаратуры. "Я меў шчасце, — кажа Якуб Якубавіч, — сустракаць тых апантана-трапятких патрыётаў, якіх у нас былая партыйная наменклатура ахрысціла нацыяналістамі ды фашыстамі. У іх жа гэта культурная норма — любіць, шанаваць і памнажаць сваё нацыянальнае. Кожны новы перакладчык, новая мова для іх — гэта падзея, культурнае свята. Нярэдка ў нас прыхільнікі дзяржаўнага двухмоўя спасылаюцца на Фінляндыю. Так, у іх дзве дзяржаўныя мовы — фінская і шведская. Але як яны суіснуюць! Перш-наперш закон абавязвае грамадзян ведаць абедзве мовы. Скажам, калі да цябе звяртаюцца на шведскай мове, будзь ласкавы адказваць толькі пашведску. Інакш можа дайсці да судовай справы. Нарэшце, паміж беларусамі і фінамі шмат прывабна агульнага. Скажам, свята Купалля ў іх такое ж паэтычнае і прыгожае, як і на Беларусі".

Игра и вне игры!

При частичном отсутствии денег самое главное — не потерять голову

Алесь СИВЫЙ

Как говорил поэт, "самое страшное в мире — это быть успокоенным". Успокоенность у хоккеистов минского клуба "Тивали", судя по приметам, наступает в трех случаях: после заграничного вояжа, получения "зеленых" после длительного отсутствия оных, после рождественских и других дней "отдыха". К счастью или несчастью — весь предновогодний месяц "тивалята" вдоволь поколесили по миру, получили премиальных по 260 долларов США (официально сумма не подтверждена), и, соответственно, встретили Новый год и Рождество Христово. Плюс к этому "пятый клуб в Европе" занимает сегодня стабильное девятнадцатое место в чемпионате МХЛ, так что поводов к разным там беспокойствам нет.

Возобновившиеся игры первенства МХЛ лишний раз подтвердили это, когда минский клуб "Тивали" принимал у себя на площадке екатеринбургский "Автомобилист". Уже после первого периода два броска Чернявского заставили болельщиков поверить, что наши ребята самые что ни на есть "пятые в Европе". Второй период — 2:1 — поколебал эту веру, а третий и дополнительная пятиминутка позволили усомниться в вышеназванном постулате. Ничья — 2:2 и, как выразилась бы западная пресса, падкая на жирный шрифт и броские заголовки: "Пятый клуб в Европе играет вничью с 22-й командой МХЛ".

Не вдаваясь в анализ игры и действия судей, отмечу вот что: наши хоккеисты играют в хороший хоккей только тогда, когда они в этом заинтересованы. Увы, в нынешнем первенстве мечтать о каких-либо лаврах и тем более благах "тивалятам" попросту не приходится, конкуренции со стороны других белорусских клубов нет, да и зарплата не Бог весть какая. Это в НХЛ Александру Могильному за каждую заброшенную шайбу платят 8 тысяч долларов — так за такие деньги и наши ребята летали бы, как пчелки, все три периода. Что до спонсоров, то они стараются приберечь свои деньги до лучших времен. Хотя фирмы "Амкодор" и "Мотовело", спонсировавшие поездку белорусской сборной на "Приз "Известий", думаю, остались не в накладе — трансляции хоккейных матчей велись на многие страны мира, за исключением разве что нашей. Жаль болельщика! Ему-то какой прок с того, что "Тивали" хорошо играют за "бугром"? И что проку с такой игры, какую показали минские хоккеисты в крытом Дворце спорта парка Горького?!

Ну а теперь о других новостях спортивной жизни нашей республики. Гандбольная сборная Беларуси, пробирающаяся сквозь тернии к финалу чемпионата Европы, сыграла обе встречи с командой Исландии на выезде. И если уже в первой игре наши гандболисты дали понять исландцам, зачем они сюда приехали — счет 26:23 в пользу белорусов, то вторая встреча позволила упиваться победными криками хозяевам площадки. Правда, ликующих возгласов явно поубавилось при ближайшем рассмотрении групповой таблицы, поскольку второй командой, которая поведет дальнейшую борьбу за путевку в европейский финал, уже теоретически стала команда Беларуси. А практически, при всех благоприятных раскладках, исландцы могут догнать и перегнать нашу сборную лишь при условии, что сократят разницу в 29 мячей. Пофантазируем! Сегодня же белорусские гандболисты играют в гостях с хорватами. Победитель без лишних тяжб выходит в финал.

Зимний период застоя в футболе, как уже сообщала наша газета, был ознаменован проявлением особого внимания к "скромной" персоне игрока могилевского "Днепра" Мирославу Ромащенко, который в мгновение ока "знік" в направлении Урала. По последним сообщениям, на днях путешественник объявился уже на Украине, откуда телефонировал в родной клуб и констатировал о своем добром здравии и желании играть за "Уралмаш". От уральских товарищей, кстати, ни слуху ни духу.

Между тем футбольный клуб "Динамо-93", дабы не растерять своих игроков, решил отправиться (предположительно — 15 января) в Германию, где проведет три встречи. Такие вот новости!

Зеркальце

Роза вянет от мороза — и в этом ее главное отличие от женщины

Если ваш идеал красоты не снежная баба и красный нос вам ни к чему, запомните несколько простых правил ухода за кожей в морозные дни.

Обладательницы сухой и нормальной кожи должны утром умываться не менее чем за час до выхода на улицу. В мороз можно и вовсе не умываться: ваша природная чистоплотность нисколько не пострадает, если по утрам просто протирать лицо ваткой, смоченной в косметическом молочке. Перед уходом лицо лучше смазать питательным кремом, слегка припудрить. Но ни в коем случае не употребляйте при минусовой температуре увлажняющий крем.

В воскресенье, если предстоит приятная лыжная прогулка, крема потребуется больше. Зато отложите до вечера яркую губную помаду — она не очень гармонирует с раскрасневшимся, обветренным лицом.

Если вы нашли, что лицо в порядке, а отведенный "для себя" час-другой еще не кончился, сделайте себе творожную или дрожжевую маску. Для первой потребуется пара ложек свежего творога и желток, для второй — треть палочки дрожжей, несколько капель меда и, если кожа сухая, чуть-чуть растительного масла.

Снег способен порадовать наш глаз не только своей белизной и свежестью. С балкона или подоконника всегда можно наскрести пригоршню-другую снега, необходимую для компресса. Компресс делается так: снег плотно закручивается в полотенце, салфетку или носовой платок и довольно плотно прикладывается несколько раз к лицу и шее до тех пор, пока лицо не замерзнет. Через несколько минут кожа разгладится и приобретет забытый с осени румянец.

Покрасневшие, сухие руки тоже не обязательно прятать. Лечить их можно ванночками из воды, слитой с отварной картошки, или делая переменные ванночки — то горячие, то холодные. Чтобы руки не страдали, их тоже лучше мыть задолго до выхода на улицу. После каждого мытья и перед сном хорошо бы втирать в них немного крема для рук.

Ці чулі?

Захацеў — паехаў...

Новыя нацыянальныя пашпарты пачнуць выдаваць ужо ў другім квартале 1994 года.

У новым нацыянальным пашпарце кожны жадаючы зможа паставіць сабе выязную візу ў АВІРы па месцы жыхарства, незалежна ад таго, ці ёсць у яго запрашэнне, пуцёўка ці іншы дакумент, які засведчвае неабходнасць выезду ў якую-небудзь краіну.

Калі паездка за мяжу патрабуе афармлення ўязной візы, то яе будзе афармляць пасольства пры прад'яўленні пэўнага дакумента.

Неверагоднасці свету

Знішчальная энергія

— У кожным чалавеку ёсць невымерны запас энергіі. Не пытайцеся ў мяне, што гэта за энергія. Я не ведаю. Ведаю толькі, што яна ёсць. Усе мы павінны гэта ведаць і павінны навучыцца яе кантраляваць, — сказаў у інтэрв'ю амерыканскаму тэлебачанню прафесар Сэн Мак-Гроу, фізік, які ўжо даўно вывучае прыроду біятокаў.

Гэта інтэрв'ю было дадзена з выпадку трагедыі, што адбылася ў канцы мінулага года ў Фларыдзе. Тады знайшлі астанкі 50-гадовай Аманды Пэл. Медыцынскі эксперт дакладна іх апісаў: змуміфікаваная галава, фрагменты пазваночніка і левай нагі, усё астатняе цалкам спапялёнае.

Ужо на першым этапе следства ўстанавілі, што прычынай смерці не мог быць пажар. Згарэлі толькі тыя прадметы, якія знаходзіліся побач з жанчынай: крэсла, столік ля яго, частка дывана. Усё астатняе агонь не крануў. Не выяўлена крыніца агню. Адверглі гіпотэзу, што жанчына спаліла сябе сама. У такім выпадку павінны былі быць якія-небудзь доказы, напрыклад сляды бензіну. Дзіўна таксама, што галава скурчылася да маленькіх памераў, хоць у падобных выпадках бывае наадварот. Усё ўказвала на тое, што крыніца агню павінна была знаходзіцца ўнутры цела!

Падобны выпадак апісаў у адным са сваіх твораў Чарльз Дзікенс. Калі яго абвінавацілі ў залішнім фантазёрстве, ён адказаў, што ў гісторыі зафіксаваны некалькі дзесяткаў падобных выпадкаў.

Як вынікае з трагедыі, да самаўзгарання даходзіць і цяпер. У 1990 годзе пры падобных акалічнасцях памерла інвалідка, прыкаваная да каляскі. Сведкай была сястра, якая спрабавала патушыць агонь, але ён кожны раз успыхваў з новай сілай.

На думку прафесара Мак-Гроу, прычынай самазапалення з'яўляецца выхад энергіі, якая знаходзіцца ў целе чалавека. У некаторых людзей яе вельмі шмат. Прыкладам таму служаць біяэнергатэрапеўты, якія лішак энергіі аддаюць іншым у час сеансаў.

Ёсць, аднак, людзі, якія не ўсведамляюць, што маюць лішак такой энергіі. Гэта і прыводзіць да трагедый. Яна можа выбухнуць ці ўнутры цела, ці за яго межамі. Былі выпадкі такой смерці ці самаўзгарання без усялякіх прычын навакольных прадметаў. І гэта гіпотэза ўяўляецца даволі слушнай.

(Па матэрыялах замежнага друку.)

Вам збіраюцца паказаць...

Д з я р ж а ў н ы я рэгістрацыйныя пасведчанні атрымалі мастацкія фільмы:

1. "Тры ніндзя" — захапляючы кінааповяд пра трох маленькіх братоў, якія авалодваюць майстэрствам ніндзя з мэтай дапамагчы блізкім сваякам. Вытворчасць — ЗША. Правы пракату належаць АТ "Інтэркін".

2. "Вулічны баец" — вострасюжэтны баявік. Вытворчасць —ЗША. Правы пракату належаць АТ "Інтэркін".

3. "Гадзіны адчаю" — кінарасказ пра сутычку гаспадароў дома з уцёкшым з залы судовага пасяджэння злачынцам. Вытворчасць — ЗША. Правы пракату належаць АТ "Інтэркін".

Відэафільмы:

1. "Музы Слоніма" — пра сучаснае жыццё і славутыя мясціны старажытнага горада Беларусі. Вытворчасць РВТА "Белвідэацэнтр". Правы пракату належаць РВТА "Белвідэацэнтр".

2. "Уваскрашэнне традыцый" — стужка пра велікодныя абрады на Беларусі. Вытворчасць РВТА "Белвідэацэнтр". Правы пракату належаць РВТА "Белвідэацэнтр".

"Яр"

Яр — вялікі запаведны лес непадалёку ад Тулы.

У дапятроўскія часы стаяла тут вялікае сяло, жыхары якога і зямлю аралі, і па жалезу ўмелі працаваць, стрэльбы і пісталеты выраблялі. Хоць і лічыліся яны па запісах за нейкім панам, але былі людзі свабоднага, незалежнага нораву.

Аднойчы паявіўся ў сяле прышлы майстар Канстанцін Караў. Яму, былому салдату, які шмат перажыў і пабачыў на сваім вяку, даспадобы прыйшліся тутэйшыя прасторы...

"Путана"

Калісьці прастытуцыя падалася ёй больш прывабнай, чым сумная перспектыва пайсці на курсы вадзіцеляў трамваяў, як цынічна параіў былы каханы...

Расстаўшыся з ім, Вольга мучылася пытаннем — дзе жыць, куды пайсці? І інтэрнат трамвайнага дэпо пужаў больш, чым вуліца. Але і гэтае, прыгожае толькі знешне жыццё было Вользе не даспадобы. То з кліентамі праблема, то сутэнёры сваё патрабуюць, то канкурыруючая групоўка перакрывае іхняй "фірме" кісларод...

"Падстаўное цела"

... Не ўсё ладзіцца ў жыцці маладога няўдачлівага акцёра — ёсць праблемы і ў творчасці, і ў асабістым плане.

Каб змякчыць дэпрэсію, ён знаходзіць сабе невялікую забаву — па вечарах назірае ў падзорную трубу за выканаўцай стрыптызу. І вось аднойчы акцёр у час свайго занятку, які ўжо стаў прывычным, бачыць, як здзяйсняецца зверскае забойства... Нямала вельмі небяспечных сітуацый давядзецца перажыць герою, які стаў сведкам злачынства...

Праграма тэлеперадач

Серада, 12 студзеня

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30 Пяць хвілін на жарты.
8.35. "Ірына Оціева". Фільм-канцэрт (ВМЗ).
9.00. Музыка. 5-ы клас.
9.30. "Ніхто, акрамя цябе". Тэлесерыял.
10.15. "Адраджэнне беларускай капэлы". Заключны канцэрт.
11.25. Пераблытанка. Музычная праграма-жарт.
12.00. Бар'еры. Праблемы інваспорту.
12.25. "Задыяк". Маст. фільм.
13.30. Навіны.
13.40. "Зачараваны вандроўнік". Маст. фільм.
15.25. "Сунічны дождж". Мультфільм.
15.35. Відзьма-нявідзьма.
16.35. Голас.
17.30. Навіны (з сурдаперакладам).
17.40. Эдзі Тырманд. Харавыя творы.
18.10. Абласныя навіны (Гомель).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. "Пяць зорак". Тэлегульня.
20.00. І скарачаецца імгненна адлегласць... Аб тэхнічнай альтэрнатыве дзяржаўнаму тэлебачанню.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Надвор'е.
21.55. Пяць хвілін на жарты.
22.00. "Ніхто, акрамя цябе". Тэлесерыял.
22.45. НІКа.
23.00. Хакей. "Цівалі" (Мінск) — "Авангард" (Омск).
23.35. А с а ц ы я ц ы я кінематаграфістаў. Кінарэжысёр У. Корш-Саблін.

Канал "Астанкіна"

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00. Навіны.
5.20. Ранішняя размінка.
5.30. Раніца.
7.45. "Кароль і дыня". Мультфільм.
8.20. Сарока.
8.40. "Проста Марыя".
9.30. Дак. фільм "Святое месца".
10.20. Джэм.
10.50. Прэс-экспрэс.
11.20. Дак. фільм "На маім вяку".
12.15. "Той самы Мюнхгаўзен". 2-я серыя.
13.20. Дак. фільм "Апалінараўна".
13.40. Мы доўгае рэха адзін аднаго. Памяці Я. Пцічкіна.
14.25. Прадпрымальнік.
15.20. Кароткаметражны фільм "Кешка і барада".
15.45. Джэм.
16.15. Клуб-700.
16.45. Вяртанне да гледача.
17.25. Тэлерадыёкампанія "Мір".
17.55. Дакументы і лёсы.
18.00. Надвор'е.
18.05. "Проста Марыя".
18.55. Аўтарская праграма Э. Разанава.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.35. Надвор'е.
20.45. "Падвескі каралевы". Кінаканцэрт.
21.40. Маст. фільм "Люмі".
23.25. Музыка для ўдарных інструментаў.
23.50. Аўтаралі Парыж—Дакар—Парыж.
0.20. MTV.
1.20. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
7.20. Патрабуюцца...
7.30. Час дзелавых людзей.
8.05. "Пушкінскі дом". Малюнкі Фёдара Дастаеўскага.
8.25. "Славенія". Відэафільм.
9.00. З першай сустрэчы нашай.
9.55. Мульці-пульці.
10.05. Джэнтльмен-шоу.
10.35. Новая лінія. "Формула бяспекі".
11.05. "Санта-Барбара".
11.55. "Фрак народа".
12.40. Сялянскае пытанне.
13.25. "На залатым ганку сядзелі". Маст. фільм.
14.35. Тэлегазета.
14.40. Залатая шпора.
15.10. М-трэст.
15.25. Там-там навіны.
15.40. Студыя "Рост".
16.10. Мульці-пульці.
16.30. "Далёкі Усход".
17.15. Злучаныя дзяржавы Амерыкі.
17.55. Партрэт на фоне свастыкі.
18.25. Я — лідэр.
18.45. Свята кожны дзень.
19.25. Падрабязнасці.
19.35. "Санта-Барбара".
20.25. L-клуб.
21.15. 60 мінут.
22.40. Аўтаімгненне.
22.45. Зоркі гавораць.
22.50. Спартыўная карусель.
23.05. Цішыня N 9.
0.05. Экран крымінальных паведамленняў.
0.15. Валейбол. Кубак еўрапейскай канфедэрацыі.

Санкт-Пецярбург

6.35. "Аліса ў Зазяркаллі".
6.45. Інфарм-ТБ.
7.05. "На парозе ночы". Маст. фільм.
8.00. Новы Пецярбург.
8.30. Музычныя партрэты.
9.10. Еўрапейскі калейдаскоп.
9.40. Мультфільм.
9.55. Там, дзе жыве Павуціныч.
10.10. Музыка — дзецям.
10.20. Тэлемагазін.
10.30. Хуткая дапамога.
11.00. Спявае А. Дольскі.
11.30. Інфарм-ТБ.
11.40. Падарожжа па Усходзе.
12.00, 14.25, 18.05, 20.45, 0.10. Музычны момант.
12.05. "Сярэбраная ніць". Для пажылых.
12.50. "Леў Гурыч Сінічкін". Маст. фільм.
14.15. "Калі я быў маленькі". Мультфільм.
14.30. Інфарм-ТБ.
14.40. Сам-насам з музыкай.
15.25. А. С. Пушкін. "Маленькія трагедыі".
15.55. "Піліп Траум". Маст. фільм. 1-я серыя.
17.00. Мультфільмы.
17.20. Дазвольце далажыць.
17.30. Канверсія па-амерыканску.
18.10. Вялікі фестываль.
18.30. Інфарм-ТБ.
18.55. "Бліскучы Санкт-Пецярбург".
19.40. Спорт.
20.00. Сёння.
20.40. Тэлемагазін.
20.50. "Мядзведзь і лялька". Маст. фільм.
22.15. Л. Бакерыні. "Квінтэт".
22.35. Ваш стыль.
22.45. Інфарм-ТБ.
23.05—0.15. "Макартні". Музычная праграма.

Па просьбе чытачоў

Чацвер, 13 студзеня

8-ы канал (г.Мінск)

18.00. Праграма перадач.
18.05. Шматсерыйны фільм для дзяцей "Карусель". Мультфільм "Кароль Мідас" з серыі "Аміга і яго сябры".
18.30. Музычная праграма.
19.10. Шматсерыйны тэлевізійны фільм "Я купляю гэтую жанчыну". 93, 94, 95 і 96-я серыі.
20.40. Паліцэйскі серыял "Хіл Стрыт Блюз": "Розумы і сэрцы".
21.45. Маст. фільм "Бясстрашная Паліна".
23.20. Праграма відэакліпаў.
23.30. Праграма перадач на заўтра.

Пятніца, 14 студзеня

8-ы канал (г.Мінск)

18.00. Праграма перадач.
18.05. Шматсерыйны фільм для дзяцей "Карусель". Мультфільм "Бокс" з серыі "Аміга і яго сябры".
18.30. Музычная праграма.
19.10. Шматсерыйны тэлевізійны фільм "Я купляю гэтую жанчыну". 97, 98, 99 і 100-я серыі.
20.15. Паліцэйскі серыял "Хіл Стрыт Блюз": "Крывавыя грошы".
21.45. Маст. фільм "Сабакі ў космасе".
23.20. Праграма відэакліпаў.
23.30. Праграма перадач на заўтра.

Субота, 15 студзеня

8-ы канал (г.Мінск)

15.00. Праграма перадач.
15.05. Спартыўная праграма фірмы "Жылет".
15.30. Праграма аб здароўі "Жыццёвы выбар": "Майкл Джордан — супергерой".
16.00. Іерусалім. Студыя "Алеф".
17.00. Музычная праграма.
17.30. Прыгодніцкі серыял "Заліў "Небяспечны": "Шалёныя мядзведзі".
18.00. Тэлечасопіс "Відэамода": "Легенда Крысціяна Дзіора".
18.30. Шматсерыйны фільм для дзяцей "Карусель". Мультфільм "Марка Пола" з серыі "Аміга і яго сябры".
19.10. Шматсерыйны тэлевізійны фільм "Я купляю гэтую жанчыну". 101, 102, 103 і 104-я серыі.
20.40. Паліцэйскі серыял "Хіл Стрыт Блюз": "Апошні белы на Іст Феры авеню".
21.45. Маст. фільм "Д'ябальскія душы".
23.20. Праграма відэакліпаў.
23.30. Праграма перадач на заўтра.

Нядзеля, 16 студзеня

8-ы канал (г.Мінск)

15.00. Праграма перадач.
15.05. Шматсерыйны фільм для дзяцей "Карусель". Мультфільм "Мадрыд" з серыі "Аміга і яго сябры".
15.30. Шматсерыйны фільм "Лёс". 5-я серыя.
16.15. Опра уінфры-шоу: "Маленькія геніі".
17.00. Музычная праграма: "У мяжы Осціна": "Кэці Матэ".
17.30. Камедыйнае шоу "Схаваная камера".
17.50. Разважанні пра джаз.
18.40. Тэлевізійны часопіс "Суперсцэна".
19.10. Шматсерыйны тэлевізійны фільм "Я купляю гэтую жанчыну". 105, 106, 107 і 108-я серыі.
20.40. Паліцэйскі серыял "Хіл Стрыт Блюз": "Другая старажытнейшая прафесія".
21.45. Маст. фільм "Залатая рука".
23.20. Праграма відэакліпаў.
23.30. Праграма перадач на заўтра.

Надвор'е

Сёння днём па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, месцамі невялікія ападкі, на дарогах галалёд, у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ў Гродне, Брэсце — 1—3 градусы цяпла, Мінску — каля нуля, Гомелі — 1—3, Магілёве — 2—4, Віцебску — 3—5 градусаў марозу.

У наступныя двое сутак: 13-га — у паўночна-заходніх раёнах, 14-га — месцамі ападкі, туман і галалёд. 13-га ноччу і раніцай ва ўсходніх раёнах на дарогах галалёд. Тэмпература паветра ноччу ад 4 градусаў марозу да 1 градуса цяпла, днём — каля нуля, 13-га на ўсходзе ноччу 3—8, днём — 0—5 градусаў марозу.

Астранамічны каляндар — 12.01

Узыход і заход сонца: Мінск — 8.22, 16.12; Віцебск — 8.19, 15.56; Магілёў — 8.11, 16.02; Гомель — 8.01, 16.06; Гродна — 8.36, 16.29; Брэст — 8.29, 16.37.

Даўжыня дня ў Мінску — 7 гадзін 50 мінут.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Рэкламнае бюро — тэл./факс — (0172) 68-25-29; 68-26-24.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, калі ў матэрыялах змешчаны даныя, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Лісты чытачоў друкуюцца на мове арыгінала. Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Рэдакцыя "Народнай газеты" прымае заказы на змяшчэнне аб'яў, рэкламы.

Рэдакцыйныя тэлефоны: прыёмная галоўнага рэдактара — 68-28-70; юрыдычнае бюро — 68-25-98; стыльрэдактар — 68-26-03; мастак — 68-26-36; бухгалтэрыя — 32-46-55; бізнес-бюро — 68-26-87.

Аглядальнікі па пытаннях дзейнасці: парламента рэспублікі, грамадска-палітычных арганізацый і рухаў — 68-26-82; урада рэспублікі — 68-28-63; дзяржаўных органаў — 68-26-57; аграрнай палітыкі — 68-25-56; экалогіі, ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай трагедыі і НТП — 68-25-97; сацыяльнай пераарыентацыі эканомікі — 68-26-56; сацыяльнай пераарыентацыі сферы абслугоўвання — 68-25-98; сацыяльнага вывучэння грамадскай думкі і аналізу пошты — 68-25-59; культуры і нацыянальнага адраджэння — 68-25-96; маралі і права — 68-25-07, 68-26-76; сацыяльнай абароны асобы — 68-26-89; адміністрацыйных органаў — 68-26-78; аператыўных падзей, фізкультуры і спорту — 68-25-96; палітычныя каментатары — 68-26-74, 68-26-77.

Тэлефоны карэспандэнцкіх пунктаў: у Брэсце — 5-73-19; у Віцебску — 5-12-12; у Гомелі — 55-81-05; у Магілёве — 26-35-38; у Маскве — 365-16-44.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул Б. Хмяльніцкага, 10а.

Індэкс 63868

Заснавальнік — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.
Адрас: Мінск, вул. К. Маркса, 38.
Выходзіць штодзённа, акрамя нядзелі і панядзелка. 250 разоў у год.
Падпісана ў друк у 19.10.
Газета аддрукавана ў друкарні выдавецтва "Беларускі Дом друку". Адрас: Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77.
Спосаб друку — афсетны, фармат А-2
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ